# МІКРАТАПОНІМЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБШЧЫНЫ, СУАДНОСНЫЯ З НАЗВАМІ ЖЫВЁЛ

***Драба І.А.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Семянькова Г.К., канд. . філал. навук, дацэнт

Кожны населены пункт і любы значны геаграфічны аб’ект мае сваю назву, дадзеную чалавекам. Неафіцыйныя найменнні малых геаграфічных аб’ектаў (лясоў, палёў, балот, урочышчаў, камянёў, пагоркаў, палян) вывучае мікратапаніміка, даследуючы іх паходжанне, сэнсавае напаўненне, вымаўленне, напісанне і інш.

Вядома, што носьбітамі неафіцыйных назваў з’яўляюцца найперш мясцовыя жыхары, але з цягам часу такія найменні страчваюцца і забываюцца. Таму *актуальнасць* праведзенага даследавання звязана з неабходнасцю зафіксаваць арыгінальны, самабытны матэрыял, праз які выяўляюцца прынцыпы тапаўтварэння, інфармацыя пра людзей і іх асаблівасці, месцазнаходжанне геаграфічных аб’ектаў, што зніклі. *Мэта* артыкула – выяўленне і даследаванне матывацыі сучасных мікратапонімаў Віцебшчыны, звязаных з назвамі жывёл.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праводзілася на аснове матэрыялу, сабранага ў 18 раёнах Віцебскай вобласці (Аршанскі, Браслаўскі, Верхнядзвінскі, Віцебскі, Гарадоцкі, Глыбоцкі, Докшыцкі, Дубровенскі, Лепельскі, Лёзненскі, Міёрскі, Полацкі, Пастаўскі, Расонскі, Сенненскі, Талачынскі, Чашніцкі, Шаркаўшчынскі). Асноўнымі метадамі даследавання з’яўляюцца апісальны метад і метад сістэмнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Заамікратапонімы, або мікратапонімы, суадносныя з адзінкамі заанімнага характару, валодаюць дастатковай інфарматыўнасцю, паколькі даюць магчымасць атрымаць дадатковыя веды пра фаўну пэўнай мясцовасці. У нашым матэрыяле група мікратапонімаў, што паходзяць ад назваў жывёл, уключае 23 прыклады. Усе заамікратапонімы былі падзелены намі на наступныя групы:

1. Найменні, суадносныя з назвамі млекакормячых.
2. Найменні, утвораныя ад назваў рэптылій.
3. Найменні, суадносныя з арнітонімамі.
4. Найменні, утвораныя ад іхтыёнімаў.

Група найменняў, утвораных ад назваў млекакормячых, з’яўляецца самай шматлікай і ўключае 16 адзінак. У сваю чаргу гэтыя назвы былі падзелены намі на дзве падгрупы: найменні, суадносныя з паняццем “дзікі звер”, і адзінкі, суадносныя з паняццем “свойская жывёла”.

Заўважана, што найменні першай падгрупы выкарыстоўваюцца пры называнні ўрочышчаў, якія не знаходзяцца ва ўласнасці жыхароў бліжэйшых населеных пунктаў: *Ліссія норы* – вялікі пагорак, дзе размешчана шмат лісіных нор (вёска Парэчча Талачынскага раёна); *Дзіч* – балота, дзе можна сустрэць шмат дзікоў (аграгарадок Параф’янава Докшыцкага раёна); *Мядзведзіха* – частка вёскі, што знаходзілася непадалёку ад лесу, у якім вадзіліся мядзведзі (вёска Нябышына Докшыцкага раёна).

У другую падгрупу намі былі ўключаны наступныя прыклады: *Казлы* – частка вёскі, аддзеленая дарогай ад усёй вёскі; па словах мясцовых жыхароў, раней на гэтым месцы знаходзілася ферма, дзе гадавалі коз (вёска Вярэнькі Пастаўскага раёна); *Цялятнікі* – месца непадалёку ад могілак, на якім раней пасвілі цялят (горад Барань Аршанскага раёна).

Падгрупа мікратапонімаў, што паходзяць ад назваў дзікіх звяроў, прэвалюе над групай назваў ад свойскіх жывёл: колькасныя суадносіны складаюць 2:1 (10 і 6 назваў

адпаведна). Мы мяркуем, што гэта можа быць абумоўлена тым, што плошча тэрыторыі, якая знаходзіцца пад “уладай” дзікай прыроды, значна пераважае плошчу тэрыторыі, асвоенай і выкарыстанай людзьмі для вядзення гаспадаркі.

У групу найменняў, утвораных ад назваў рэптылій, уваходзіць усяго 3 найменні: *Змяінае балота* – участак лесу сярод палёў; раней у гэтым месцы размяшчалася мохавае балота без вады, у ім вадзілася шмат змей (вёска Сар’я Верхнядзвінскага раёна); *Змееў камень* – камень у лесе каля вёскі; згодна з легендай, тут жыў аднагаловы Змей, які быў добрым краўцом і ўмеў ператварацца ў чалавека (вёска Гогалеўка Чашніцкага раёна); *Змяёўка* – поле, на якім вадзілася шмат змей (вёска Савуткі Шаркаўшчынскага раёна). Як відаць з прыкладаў, усе прыведзеныя вышэй назвы суадносяцца са словам “змяя” і выкарыстоўваюцца ў розных рэгіёнах Віцебскай вобласці. Змеі – важны элементам прыроды, яны з’яўляюцца небяспечнымі і пагражаюць жыццю людзей і жывёл. Мікратапонімы ўказваюць на наяўнасць змей у тым ці іншым месцы, папярэджваюць мясцовых жыхароў аб небяспецы.

Да групы найменняў, утвораных ад арнітонімаў, мы аднеслі 3 мікратапонімы: *Жураўліны холм* – гара ў вёсцы, дзе знаходзіцца магіла Героя Савецкага Саюза У.П. Краева. Калі адбываліся пошукі рэшткаў байцоў Вялікай Айчыннай вайны, над атрадам праляцеў клін белых жураўлёў (вёска Пабедзіншчына Віцебскага раёна); *Лябяжае возера* – возера, афіцыйная назва якога – возера Голбія; неафіцыйная назва ўтварылася з-за таго, што на возеры заўсёды жывуць лебедзі (вёска Голбія Пастаўскага раёна); *Жураўлёва балота* – поле, на якім часта можна сустрэць жураўлёў (аграгарадок Камень Лепельскага раёна). Як відаць з прыкладаў, мікратапонімы гэтай групы характарызуюць не толькі асаблівасці фаўны мясцовасці, але і падзеі, звязаныя з птушкамі.

Да найменняў, утвораных ад назваў рыб, у нашым матэрыяле адносіцца 1 мікратапонім: *Ляшчоўка* – мель на возеры Снуды, якая носіць сваю назву з-за таго, што на гэтым месцы можна атрымаць добры ўлоў ляшчоў (вёска Крывасельцы Браслаўскага раёна).

**Заключэнне.** Такім чынам, прааналізаваўшы мікратапонімы Віцебшчыны, мы можам зрабіць выснову аб тым, што яны характарызуюцца разнастайнасцю ў семантычным плане: сярод іх вылучаюцца адзінкі, суадносныя з назвамі дзікіх звяроў, свойскіх жывёл, рэптылій, арнітонімаў, іхтыёнімаў. Найбольш распаўсюджанымі з’яўляюцца найменні, матываваныя назвамі млекакормячых, прыкладна аднолькавымі па колькасці – рэптылій і птушак, адзінкавымі – рыб.


7. Адамовіч, Я.М. Мікратапанімічныя назвы / Я.М. Адамовіч. – Мінск: Вышэйшая школа, 1971. – 112 с.
8. Беларуская антрапанімія: вучэбны дапаможнік / Г.М. Мезенка (навук. рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2009. – 254 с. – Рэжым звароту : https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/2378/5/Беларуская антрапанімія.pdf. – Дата звароту : 11.03.2024.
9. Ономастика Беларуси. Топонимия: учебник / А.М. Мезенко [и др.]; под ред. А.М. Мезенко. – Минск: РИВШ, 2018. – 320 с.
10. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны : у 2 ч. / Л.І. Злобін (рэд.) [і інш.]. – Віцебск : УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2012. – Ч. 1. – 304 с. – Рэжым звароту : https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/14704/1/ГотовоеЧ.1.pdf. – Дата звароту : 11.03.2024.
11. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны : у 2 ч. / склад. : Г.К. Семянькова, Т.А. Грачыха, А.С. Дзядова [і інш.] ; пад рэд. А.С. Дзядовай. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2014. – Ч. 2. – 358 с. – Рэжым звароту : https://rep.vsu.by/handle/123456789/14042. – Дата звароту : 11.03.2024.
12. Шклярык, В.А. Мікратапанімія Усходняга Палесся ў кантэксце развіцця рэгіянальнай лексічнай сістэмы / В.А. Шклярык ; навук. рэд. І.Л. Капылоў. – 2-е выд. – Мінск: Беларуская навука, 2019. – 196 с.